ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№10 (1084)
ЧАЦВЕР,
19 мая
2005 г.

Выходзіць два разы ў месяц

Цана дагаворная

# ГОМЕЛЬСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ



Газета заснавана ў верасні 1969 года

Універсітэт перад'юбілейны

75

## НА ПРЫСУДЖЭННЕ ВЫСОКІХ УЗНАГАРОД

**(СА СХОДУ ПРАЦОЎНАГА КАЛЕКТЫВУ ГДУ)**

**На мінулым тыдні ў актавай зале адбыўся сход працоўнага калектыву універсітэта. На яго парадак дня былі вынесены пытанні аб падрыхтоўцы да 75-гадовага юбілею ГДУ і вылучэнні ў сувязі з гэтым кандыдатур для ўзнагароджання медалём Францыска Скарыны і Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Сход вёў старшыня прафкама ГДУ У.В. Арлоў, які азнаёміў прысутных з палажэннем, згодна якому ўручаюцца гэтыя высокія дзяржаўная і ўрадавая ўзнагароды: медаля Францыска Скарыны ўдастойваюцца работнікі навукі, адукацыі і культуры за выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё і прымнажэнне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа; Ганаровая грамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прысуджаецца за заслугі ў дзяржаўным, гаспадарчым, сацыяльна-культурным будаўніцтві ўмацаванні абароназдольнасці Беларусі.**



На сходзе выступіў рэктар універсітэта прафесар А.У. Рагачоў. Ён адзначыў, што калектыў ГДУ знаходзіцца зараз на этапе актыўнай падрыхтоўкі да знамянальнай даты. Так, упершыню ў гісторыі універсітэта калектывам аўтараў на аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў, часам нават цяжкадаступных, падрыхтавана кніга аб станаўленні і развіцці нашай вну; гатовы таксама выданне аб дактарах навук, прафесарах, якія ў свой час працавалі ў ГДУ, кніга "Універсітэт літаратурны".

– Юбілей – гэта своеасаблівы агляд нашых дасягненняў, поспехаў, – падкрэсліў Аляксандр Уладзіміравіч, – і яны будуць усебакова прадэманстраваны на выстаўцы, экспанаты якой таксама рыхтуюцца – ужо гатовы інфармацыйныя стэнды па самых розных напрамках дзейнасці універсітэта.

Прыкметныя змены да лепшага адбыліся ў знешнім абліччы вучэбных карпусоў №1, №4, дзе выкананы вялікі аб'ём рамонтна-будаўнічых работ. Абноўлена актавая зала: заменены крэслы, свяцільнікі, пакрыццё падлогі. Плануецца яшчэ шмат чаго зрабіць у вучэбных карпусах №2 і №5. Рэктар выказаў упэўненасць, што калектыў ГДУ і надалей будзе актыўным удзельнікам усіх падрыхтоўчых работ, каб з годнасцю сустрэць тут шматлікіх гасцей з далёкага і бліжняга замежжа, запрошаных на ўрачыстасці. А яны запланаваны на 16-17 чэрвеня. У іх праграме – урачыстае пасяджэнне Савета, сход працоўнага калектыву, уручэнне ўзнагарод, выстаўка дасягненняў ГДУ, канцэрт творчых калектываў студэнцкага клуба і многае іншае.

Затым адбылося прадстаўленне кандыдатур для прысуджэння ўрадавых узнагарод. Як паведаміў старшыня прафкама У.В. Арлоў, папярэдне яны абмяркоўваліся на пашыраным пасяджэнні рэктарата. Гэтага высокага гонару ўдастоены доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай літаратуры Валянціна Станіславаўна Новак і доктар біялагічных навук, прафесар кафедры батанікі і фізіялогіі раслін Леанід Міхайлавіч Сапегін.

З аўтабіяграфічнымі дадзенымі В.С. Новак пазнаёміў дэкан філалагічнага факультэта дацэнт У.А. Бобрык **(на здымку)**, у падтрымку яе кандыдатуры выступілі загадчыкі кафедр: беларускай літаратуры – д.ф.н., прафесар І.Ф. Штэйнер, беларускай мовы – д.ф.н., прафесар А.А. Станкевіч, рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт" Т.М. Дубяк. Яны ахарактарызавалі В.С. Новак як выдатнага выкладчыка, які вядзе заняткі па міфалогіі, фальклору; удумлівага вучонага, які на працягу многіх гадоў вядзе актыўную работу па даследаванню фальклорна-этнаграфічнай спадчыны Беларускага Палесся. Вынікам гэтага стала выданне шматлікіх зборнікаў сабраных у фальклорных экспедыцыях матэрыялаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак. Дзякуючы намаганням Валянціны Станіславаўны ва універсітэце створаны самы буйны з усіх абласных вну фальклорны цэнтр; яна кіруе студэнцкай навукова-даследчай лабараторыяй "Вандроўнік", адной з асноўных мэт якой з'яўляецца пашырэнне геаграфіі фальклорна-этнаграфічнага даследавання тэрыторыі рэгіёна; за актыўную работу з таленавітай моладзю адзначана Спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Як вучоны, даследчык фальклору В.С. Новак шырока вядома не толькі ў межах вобласці, рэспублікі, але і ў Расіі (з'яўляецца савыканаўцай сумеснай з РАН праграмы па даследаванню пагранічнага фальклору). Валянціну Станіславаўну вызначаюць высокі прафесіяналізм, адданасць абранай справе, высокі аўтарытэт сярод студэнтаў і калег, пастаянны творчы пошук, дысцыплінаванасць, сціпласць.

Дэкан біялагічнага факультэта дацэнт В.М. Храмчанкова, загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін дацэнт М.М. Дайнэка, старшыня прафбюро біяфака С.У. Аўсеенка, дацэнт кафедры хіміі В.Р. Свірыдзенка выступілі ў падтрымку кандыдатуры д.б.н., прафесара Л.М. Сапегіна. Уся яго працоўная біяграфія звязана з нашай вну, выпускніком якой ён з'яўляецца. Леанід Міхайлавіч – адзін з самых старэйшых і вопытнейшых выкладчыкаў факультэта, дэканам якога быў на працягу многіх гадоў, узначальваў кафедру батанікі і фізіялогіі раслін. На сённяшні дзень Л.М. Сапегін – самы буйны геабатанік у Рэспубліцы Беларусь, на працягу многіх гадоў паспяхова кіруе буйнымі навуковымі праектамі, вельмі прадуктыўны вучоны па выданню падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, практыкумаў, з'яўляецца членам Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь, актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы да выдання прафесіянальных слоўнікаў на беларускай мове. Імя гэтага выдатнага вучонага шырока вядома ў навуковых колах краін далёкага і бліжняга замежжа. Большасць выкладчыкаў біяфака ГДУ – яго былыя вучні, для якіх Леанід Міхайлавіч служыць выдатным прыкладам у адданасці навуцы, абранай справе. Л.М. Сапегін узначальвае Савет па абароне доктарскіх дысертацый на факультэце, плённа кіруе навуковай работай студэнтаў. Яго сціпласць, інтэлігентнасць, сумленнасць, павага да людзей арганічна спалучаюцца з высокай кваліфікацыяй вучонага.

Удзельнікі сходу працоўнага калектыву аднагалосна прагаласавалі за абмеркаваныя кандыдатуры на прысуджэнне ім высокіх узнагарод.

**Т. НІКАЛАЕВА.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

---

Святкаванне 60-годдзя Вялікай Перамогі

## ДЗЯКУЙ ЗА ПОДЗВІГ І МІРНЫ ДЗЕНЬ



Адгрымелі святочныя салюты ў гонар 60-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Надоўга застануцца ў памяці людзей маштабныя акцыі, мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай знамянальнай даце. На ўрачыстых сходах, мітынгах жывым сведкам і ўдзельнікам той страшнай вайны выказана вельмі шмат слоў шчырай удзячнасці за наш сённяшні мірны дзень; каля помнікаў і абеліскаў адбылося ўшанаванне светлай памяці загінуўшых у барацьбе з фашызмам.



Цёпла і сардэчна віншавалі ветэранаў і ў нашым універсітэце. Іх запрасілі ў музей Францыска Скарыны, дзе кіраўніцтва ГДУ ў асобе рэктара А.У. Рагачова, прарэктараў Ю.І. Кулажанкі, І.В. Семчанкі, С.І. Ханені, дэканы факультэтаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый шчыра віталі дарагіх гасцей, жадалі ім бадзёрасці і здароўя яшчэ на многія гады, уручылі канверты з матэрыяльнай дапамогай, кветкі, сувеніры.



Не ўсе ўдзельнікі вайны, на жаль, змаглі дачакацца гэтага светлага святочнага дня: сумная вестка аб смерці паважанага ва універсітэцкім калектыве ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, д.э.н., прафесара М.В. Навучыцеля болем адгукнулася ў сэрцах. Развітацца з ім ветэраны палічылі сваім святым абавязкам: аддалі Міхаілу Веніямінавічу даніну павагі і памяці каля яго труны, устаноўленай у фае актавай залы ГДУ.

Затым адбыўся мітынг, які адкрыў прарэктар па выхаваўчай рабоце С.І. Ханеня, ўскладанне кветак і мінута маўчання каля магілы загінуўшых партызан і падпольшчыкаў, што ў студэнцкім парку. Берагчы сёння мір на зямлі, заваяваны 60 гадоў назад, – такім быў наказ ад імя пакалення пераможцаў у другой сусветнай вайне палкоўніка ў адстаўцы А.А. Косцікава **(на здымку ўнізе)**.

А ўспомніць ваенныя шляхі-дарогі, баявых сяброў, падняць за Перамогу "франтавыя" сто грамаў ветэраны мелі магчымасць на святочным агеньчыку, наладжаным у іх гонар у сталовай універсітэта **(на здымку)**. Ва ўспамінах вярнуліся яны ў ваенную пару і быццам скінулі цяжар пражытых гадоў, памаладзелі душой…

У перадсвяточныя дні ў вучэбныя аўдыторыі запрашала паважаных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны студэнцкая моладзь. Яна не толькі ўважліва слухала расказы салдат Перамогі, але і прапаноўвала сваё бачанне вайны праз выкананне песень, вершаў той пары і нават інсцэніровак, як гэта было, напрыклад, на гістарычным факультэце. Тут студэнты-першакурснікі паказалі гледачам, сярод якіх быў і ганаровы госць – ветэран Г.С. Еўдакіменка **(на здымку)**, цудоўны спектакль аб жыццесцвярджальнай сіле кахання ў гады вайны.

**Т.НІКАЛАЕВА.**
**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

---

Чернобыль – наша боль

## ПОМНИТЬ, ЧТОБЫ ЖИТЬ

Памяти Чернобыльской трагедии была посвящена ежегодная выставка плакатов студентов экономического факультета, которая состоялась 26 апреля. Каждая представленная на конкурс работа несла боль и страх человека перед великим атомом. Этими чувствами прониклись юноши и девушки, которые посетили выставку.

Были определены лучшие работы. Лауреатами конкурса плакатов «Чернобыль-2005» стали Н. Макарова (гр. ЭУ-41), И. Алиева (гр. ЭУ-41), О. Познякова (гр. ЭУ-11), Д. Асмаловская (гр. МЭ-12), П. Чух (гр. КД-31).

Выставка еще раз нам наполнила: мы все должны быть настороже, чтобы никогда не повторилась Чернобыльская катастрофа, всколыхнувшая весь мир.

**Кристина КУРС,**
**студентка экономического факультета.**

---

## ЛАЎРЭАТЫ – У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

Адбылося пасяджэнне конкурснай камісіі па абмеркаванню і вылучэнню лепшых навукова-даследчых работ на прысваенне іх аўтарам звання "Лаўрэат Скарынаўскіх чытанняў-2005 г." Сёлета ў сувязі з юбілейнай датай – 75-годдзем ГДУ – Саветам універсітэта прынята рашэнне ўстанавіць 10 прэмій з прысваеннем пераможцам конкурсу звання "Лаўрэат Скарынаўскіх чытанняў", 5-ці з іх – кіраўнікам буйных навуковых накірункаў і школ універсітэта. Сярод іх – д.х.н., прафесар А.У. Рагачоў з цыклам работ "Фізічная хімія тонкаплёначных сістэм на аснове палімерных матэрыялаў, якія фарміруюцца з актыўнай газавай фазы"; член-кар. НАН Беларусі, д.б.н., прафесар Р.Р. Ганчарэнка з цыклам работ "Генетычныя рэсурсы і генасістэматыка хвойных Паўночнай Еўразіі"; член-кар. НАН Беларусі, д.ф.-м.н., прафесар А.М. Сердзюкоў з цыклам работ "Калібровачная тэорыя скалярнага гравітацыйнага поля"; член-кар. НАН Беларусі, д.ф.-м.н., прафесар Л.А. Шамяткоў з цыклам работ "Фармацыі груп і алгебр"; д.ф.н., прафесар А.А. Станкевіч з цыклам работ "Структурна-генетычная характарыстыка навукова-тэхнічнай тэрміналогіі".

Звання "Лаўрэат Скарынаўскіх чытанняў-2005 г." удастоены таксама к.ф.н., дацэнт кафедры беларускай мовы Н.А. Багамольнікава, к.э.н., асістэнт кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю В.С. Башлакова, к.ф.-м.н., дацэнт кафедры радыёфізікі і электронікі А.В. Семчанка і ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В.З. Марчанка.

---

## З УЗНАГАРОДАЙ!



За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў дацэнт кафедры оптыкі **ГАДЛЕЎСКАЯ Ганна Мікалаеўна**, старшы выкладчык кафедры палітычнай сацыялогіі **СЕНІНА Валянціна Фёдараўна**, выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы **СМОЛАВА Тамара Васільеўна**, асістэнт кафедры беларускай культуры **ФЕЙГІНА Сафія Георгіеўна** ўзнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

# НАУЧНОМУ ТВОРЧЕСТВУ СТУДЕНТОВ – ОСОБОЕ ВНИМАНИЕ

В современном обществе постоянно возрастает роль научных знаний и информации, так необходимых будущему специалисту-профессионалу.

Т. Парсонс – один из крупнейших социологов XX столетия – особо выделяет роль университетов в подготовке интеллектуалов и профессионалов. Университетское образование, по мнению ученого, выполняет ряд важнейших функций: воспроизводство профессионалов; социализация индивидов путем усвоения норм, ценностей своей профессиональной группы и общества в целом; производство и передача профессиональных знаний; регулирование рынков услуг через выдачу дипломов и сертификатов; легитимация профессионального знания.

Неотъемлемой частью профессиональной подготовки является учебная и научная самостоятельная работа студентов, интерес к которой в последние годы заметно возрастает. Кафедра политической социологии нашего университета уделяет должное внимание студенческому научному творчеству в рамках изучения учебных курсов политологии и социологии. Ее преподаватели проводят постоянную консультативную, координационную, организационно-методическую работу по руководству самостоятельной научно-исследовательской деятельностью студентов. Возглавляет эту работу старший преподаватель М.Я. Тишкевич. Объективным ее стимулом является ежегодная итоговая общеуниверситетская конференция студентов и аспирантов «Творчество молодых» и возможность публикации научных результатов в одноименном сборнике. Нынешняя студенческая конференция проходила под знаком 60-летия Великой Победы и вызвала большой подъем активности студенческой молодежи. Студентами нашего университета в рамках секций «Политология» и «Социология» подготовлено более 50 докладов и сообщений.

Особый интерес к социально-политическим проблемам и их изучению проявили студенты физического, исторического, биологического факультетов, факультетов психологии и довузовской подготовки, иностранных языков и др.

Анализируя представленные на конференцию сообщения, следует отметить, что научно-исследовательские интересы студентов лежат в плоскости изучения политического лидерства, политической культуры, политической коммуникации и рекламы, информационных ресурсов власти и общества, социальной адаптации в постчернобыльский период, проблем студенческой семьи и т.д.

Преподаватели кафедры нацеливали студентов использовать в их научном поиске возможности взаимосвязи самостоятельных исследований со своей будущей специальностью. Например, будущие психологи готовили свои научные тезисы, используя межпредметные связи социальной психологии и политологии, политической психологии и социологии. Некоторые студенты обобщили результаты своих прикладных исследований, проведенных в процессе изучения важнейших проблем современного общества. Авторами таких работ являются Е. Вербицкая, А. Золоторенко. А. Привалов – студенты 3 курса факультета психологии, Т. Стрижак – второкурсница факультета иностранных языков, О. Мозгова, И. Серенкова, О. Глембоцкая, Т. Бужан – студентки 4 курса физического факультета.

Студенты нашего университета постоянно принимают участие в межвузовских научных конференциях и выступают с сообщениями по результатам исследований в области политологии и социологии, других общественных дисциплин. В этом учебном году, например, научные доклады были представлены нашими студентами в Гомельском филиале МИТСО, в Гомельском политехническом университете имени П.О. Сухого.

Учитывая важную роль учебной и научно-исследовательской самостоятельной работы студентов в системе подготовки высококвалифицированных специалистов, кафедра политической социологии намерена совершенствовать формы и методы этой работы, расширять возможности для проявления творческих способностей студенчества.

Таким образом, занимаясь научным поиском под руководством преподавателей, студент готовит себя к профессиональной деятельности и практическому применению своих знаний в будущем.

**В. СЕНИНА,**
**старший преподаватель кафедры политической социологии.**

Конференции

# «ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ СОВРЕМЕНОСТИ»

Во Львовском государственном университете имени Ивана Франко (Украина) состоялась II Международная научно-практическая конференция «Психологические проблемы современности» для студентов и молодых ученых.

Я приняла приглашение коллег участвовать в конференции, несмотря на неумолимо приближающиеся государственные экзамены и защиту диплома.

Львовский университет находится в самом центре города, и его старинные красивые здания поражают своей величественностью. Позволю себе даже сравнить его с одним из самых старинных и красивых университетов Европы в Болоньи (Италия), где мне довелось побывать.

В конференции приняли участие гости из ведущих вузов Украины – Киевского государственного университета имени Т. Шевченко, Запорожского, Днепропетровского, Одесского университетов, Института психологии имени Г.С. Костюка и других.

Из иностранных гостей присутствовали участники из Польши, России и Беларуси. Правда, из нашей республики я была одна, и может быть отчасти поэтому всегда находилась в окружении дружественно настроенных и гостеприимных организаторов конференции.

Интересно, что идею конференции подала и самостоятельно организовала ее проведение студентка 4 курса (!) специальности «Клиническая психология» Львовского университета Ирина Семкив. Она возглавляет Студенческое научно-практическое общество, уже второй год организовывает международные конференции. Ирине в этой кропотливой работе помогают студенты 2 курса.

Программа конференции была очень насыщенной. Кроме пленарного заседания были организованы четыре секции по клинической, педагогической, социальной психологии и психологии личности, проведены мастер-классы по темам: «Использование глины в арт-терапевтической работе», «Видео-интерактивный тренинг – системный подход в работе с семьей», «Моя семья: защита и опасность» и др. Мне очень понравился новый для меня арт-терапевтический метод по работе с глиной. По результатам конференции у меня есть чем поделиться с гомельскими студентами-психологами. Так что я вернулась с багажом новых знаний, и поездка во Львов оказалась очень познавательной.

**Александра САКОВА,**
**студентка 5 курса специальности «Психология».**

Весенняя Неделя Добра

# «ВОЗРАДУЕТСЯ ЗЕМЛЯ...»

**Благословен дающий... Дважды благословен тот, кто отдает тепло своего сердца одиноким и страждущим.**

Пятый год наш университет участвует в Республиканской Весенней Неделе Добра, которая приходится на начало светлых майских праздников, на время, когда Солнце Воскресения ярче освещает путь всем милующим и любящим своих ближних.

Радость творения добра еще более объединила студентов, преподавателей и сотрудников ГГУ в эти Дни Милосердия. Так, в преддверии 60-летия Победы в Великой Отечественной войне ректоратом, деканатом истфака, кафедрой философии, членами общества «Друг детей» – первокурсниками исторического факультета, профкомом, профкомом студентов, БРСМ, столовой ГГУ; при поддержке студентов экономического факультета, факультета иностранных языков и физической культуры, а также Гомельской областной библиотеки была организована акция «Слезы радости». В ее рамках будущие историки посетили Дятловичский сестринский участок по уходу за престарелыми, чтобы вручить этим людям не только сладости, теплые вещи, книги, но и подарить свои молодые улыбки, заботу и внимание **(на снимке)**; чтобы порадовать их концертной программой «Поклон вам, ветераны». Причем, песни военных лет они пели в каждой палате, каждому лежачему больному.



Трудно было сдержать слезы, когда старые женщины, измученные болезнью и одиночеством холодных комнат, вдруг начинали подпевать, сначала тихо, а потом все громче и громче, будто находились в теплом уютном доме в окружении детей и внуков, пришедших поздравить их с Днем Победы.

Старых новых друзей обрели члены общества «Друг детей» в Дятловичах. А вот в Журавичский дом-интернат для детей-инвалидов они наведались не в первый раз; здесь их любят и ждут. Организаторами этой акции выступили ректорат, деканат истфака, кафедра философии, профком студентов, БРСМ и, конечно, «Друзья детей». Студенты показали детям сказку «Бременские музыканты», исполнили песни, в ответ маленькие хозяева рассказывали стихи, пели, дарили свои рукотворные подарки. Праздник завершил дружный хоровод **(на снимке)**. Затем состоялся «матч»: старшие ребята предложили нашим студентам сыграть в теннис и … обыграли историков.

– Название акции «Улыбнись, малыш» оправдало себя, – рассказывает лауреат республиканской премии «Друг детей», доцент кафедры философии Тамара Петровна Гаранина. – Мы видели, что лица наших друзей светились неподдельной радостью, чувствовали единение юных и наших сердец, ощутили общую душевную и духовную близость. Нам было очень трудно расставаться, и мы пригласили детей на совместную прогулку по прекрасной аллее, вдоль которой росло очень много подснежников **(на снимке)**. Их нам ребята дарили с чувством большой благодарности за великолепие праздника. Мы шли рядом рука об руку, поддерживая и наставляя друг друга. «Дорожи жизнью», – стучали сердца одних, «крепись, теперь ты не одинок», – слышалось в ответ.



«Во имя Жизни и Любви, во имя Любви и Жизни. С Победой!» – под таким названием в канун 60-летнего юбилея Великой Победы, в один из дней недели Добра в ГГУ членами общества «Друг детей» был поставлен спектакль. Режиссером его стала народная артистка



Республики Беларусь Нина Алексеевна Корнеева **(на снимке)**. В постановке приняли участие друзья общества: Галина Радионова (авторская песня), Сергей Белов и Владимир Полоцкий (вокал, гитара).

Спектакль был построен на основе переписки молодых любящих друг друга людей, которым пришлось сполна испить горькую чашу военных испытаний. Эти письма принадлежат Любови и Льву Жаковым, близким друзьям Т.П. Гараниной, которая и предложила осуществить постановку в честь 60-летия Великой Победы. В этих письмах – история: войны, разлуки, боли... А под всем этим – история любви. Он, она и война. Она писала ему из блокадного Ленинграда, он – с фронта. Вернувшись победителем, он застал ее в состоянии тяжелой болезни – открытой формы туберкулеза. Но желание жить в любви победило смерть. Они стали счастливой семьей: четверо детей, 13 внуков, 2 правнука и настежь открытые двери для многочисленных друзей. Он стал доктором биологических наук, профессором с мировым именем, она – известной художницей.



Перед почетным гостем – участником Великой Отечественной войны Георгием Саввичем Евдокименко, преподавателями, а также студентами 1, 2 курсов исторического факультета самодеятельные актеры проникновенно передали историю любви супругов Жаковых. Так, в роли Любови выступила студентка гр. ИА-15 Анастасия Щетникова, а Льва – студент гр. И-12 Сергей Веремеев **(на снимке)**.



Песни военных лет в исполнении студентов группы ИА-14 Натальи Недашковской и Лилии Чебатковой, а также студентов группы ИА-15 Надежды Коваленко и Анны Ашурко стали гармоничным обрамлением спектакля.

* * *

**В течение всей Недели Добра студенты участвовали в акции «Тепло души»: посещали на дому участников Великой Отечественной войны, престарелых, одиноких, чтобы в очередной раз доказать: им – что они не забыты, себе – что нет большего счастья, чем согреть ставшими родными сердца.**

Т. ЦЕЛЕХОВИЧ.
Фото В. ЧИСТИКА.

Литературно-музыкальный вечер

# «МИНУВШИХ ДНЕЙ ОЧАРОВАНЬЕ»

... В 50-е гг. XIX века каждый субботний вечер в Литературный салон, что на ул. Садовой, к красавице-графине Евдокии Ростопчиной, съезжались гости, среди которых был талантливый композитор, пианист и педагог Александр Иванович Дебюк. К этому времени он уже был состоявшимся и довольно известным автором русских бытовых старинных романсов на стихи Цыганова, Дельвига, Кольцова... Графиня обратила внимание композитора на свои стихотворения «Век буду любить», «И больно и сладко». Он и написал на них музыку, тем самым добавив Ростопчиной еще один титул – автора старинного русского романса. Только Чайковский в 1870 году взялся состязаться с Дебюком в музыкальном прочтении этих стихов. Особую славу Дебюку принес его «цыганский репертуар». Например, романс «Сарафанчик» в исполнении красавицы Кати из хора Петра Соколова, быстро стал популярным. В честь Катиного «Сарафанчика-расстегайчика» в трактирах Москвы появились даже фирменные пироги под названием «расстегаи», которыми вскоре стала знаменита русская кухня.

Замечательно, что и в XXI веке имя Александра Дебюка не забыто. Об этом свидетельствует прошедший в уютной гостиной Специализированной Славянской библиотеки литературно-музыкальный вечер, посвященный известному романсисту. Напомним, что на предыдущей встрече гости Славянской библиотеки имели возможность ближе познакомиться с творчеством Евдокии Ростопчиной, поэтому естественно было вспомнить о завсегдатае ее знаменитого Литературного салона.

Знаменательно, что организация подобных мероприятий отличается постоянством учредителей и слушателей, которые не равнодушны к золотому веку русской культуры. И в этот раз праздник был подготовлен неизменным трио: филологическим факультетом ГГУ им. Ф. Скорины в лице к.ф.н., доцента Людмилы Леонидовны Ермаковой, студентов Светланы Матькуновой (гр. РФ-31) и Дениса Карако (гр. РФБ-33); коллективом Специализированной Славянской библиотеки, а также колледжем искусств имени Н. Соколовского.

В родник волнующих, тоскливых и одновременно жизнеутверждающих романсов Дебюка гости погрузились благодаря прекрасному исполнению преподавателя по классу вокала Светланы Ивановны Смолян в сопровождении Игоря Александровича Козырева, преподавателя по классу гитары.

Слушатели долго не отпускали музыкантов: хотелось, чтобы звуки романсов не обрывались.

Т. ПЕТРОВА.

# НАУЧИТЕЛЬ Михаил Вениаминович



**На 81-м году жизни умер доктор экономических наук, профессор, ветеран Великой Отечественной войны Михаил Вениаминович Научитель. Перестало биться сердце известного белорусского и российского ученого-экономиста, педагога, организатора науки и просто отличного человека.**

М.В. Научитель родился 6 августа 1924 года в городе Иркутске. Его юность совпала с Великой Отечественной войной. Он мужественно и самоотверженно исполнил свой ратный долг перед Родиной, за заслуги по защите Отечества награжден боевыми орденами и медалями.

Свое образование Михаил Вениаминович завершил после демобилизации из рядов Советской Армии, когда окончил в 1951 году планово-экономический факультет Иркутского финансово-экономического института, а в 1953 году – заочно исторический факультет Иркутского государственного университета. После окончания аспирантуры в МГУ им. М.В. Ломоносова в 1959 г. М.В. Научитель защитил кандидатскую диссертацию, а через 10 лет там же – докторскую. В 1970 году он был утвержден в ученом звании профессора по кафедре политической экономии. В Иркутском институте народного хозяйства за 20 лет работы он прошел путь от заведующего кафедрой политической экономии до проректора по научной работе.

В 1971 году М.В. Научителя пригласили на работу в Гомельский университет, где до конца 1989 г. он был проректором по научной работе. Михаил Вениаминович внес большой вклад в организацию фундаментальных и прикладных исследований, подготовку научных специалистов и научно-педагогических кадров. С его приездом в ГГУ сложилась и успешно функционирует научно-педагогическая школа по экономической теории и методологии экономической науки. М.В. Научитель – основоположник научной школы, выпускники которой являются теперь известными учеными.

М.В. Научитель – единственный доктор наук по истории экономических учений в республике, автор около 200 научных работ (монографий, брошюр, учебных пособий), популярных не только в пределах Беларуси. Под его руководством подготовлены десятки кандидатов и докторов экономических наук.

Исследовательский и педагогический талант, трудолюбие М.В. Научителя оценены по достоинству: он награжден многими правительственными наградами, удостоен почетного звания «Заслуженный работник высшей школы БССР», поощрялся первой премией Специального фонда Президента Республики Беларусь и др.

Ученый и ветеран оставался в строю, несмотря на свой возраст, был профессором кафедры экономических теорий, и все, кто работал рядом с ним, ценили его доброту, интеллигентность, порядочность, искренность и требовательность в отношении к студентам, коллегам. Михаил Вениаминович был и останется для всех отличным примером преданности любимому делу.

Светлая память о Михаиле Вениаминовиче Научителе навсегда сохранится в наших сердцах.

КОЛЛЕКТИВ ГГУ им. Ф. СКОРИНЫ.

Интервью

# РАСТУТ ЗАВТРАШНИЕ ЧЕМПИОНЫ

***Не все знают, что старший преподаватель кафедры физического воспитания и спорта, ответственный за спортивно-массовую работу на юридическом факультете В.В. Ткачев создал спортивную секцию для детей преподавателей и сотрудников ГГУ, которая работает уже свыше полугода. Как образовалась эта секция, каким образом функционирует? Об этом – беседа с Валентином Валентиновичем.***

**Расскажите, пожалуйста, как все начиналось?**

– Идея о создании спортивной секции для детей преподавателей и сотрудников возникла у бывшего председателя профкома ГГУ Георгия Ивановича Воротницкого в ноябре 2004 года. Медлить не стали, быстро провели организационное собрание родителей, которые охотно согласились привести своих детей в секцию. Ее руководителем назначили меня, и я с удовольствием согласился, т.к. живу недалеко от университета, по ул. Советской, 106, в так называемом университетском общежитии семейного типа.

**Сколько и какого возраста дети у вас занимаются?**

– На первое занятие пришло немного – 6 человек, постепенно это число стало увеличиваться. Сейчас в спортивной секции записано 23 мальчика и девочки в возрасте от 8 до 15 лет. Активно посещают занятия от 10 до 16 человек, в основном, это дети, которые живут недалеко. Из общего количества детей – 5 девочек и остальные мальчики.

**А какова структура ваших занятий?**

– Они состоят из трех частей: подготовительной, основной и заключительной. Первая включает общеразвивающие упражнения (разминка), беговую подготовку, особый упор делается на развитие гибкости и координации движения детей; сюда же включаются или эстафеты, или подвижные игры. В основную часть занятия входит обучение элементам, технике владения мячом в мини-футболе, баскетболе и волейболе. Отдельно здесь выделяется момент обучения такой игре, как бадминтон. Основная часть предполагает спортивные игры (чаще в мини-футбол). Заключительная часть занятия с детьми предусматривает упражнения на развитие силы и подвижные игры небольшой интенсивности.

**Такая обширная работа, конечно, вызывает свои трудности. В чем состоят проблемы ваших занятий?**

– Самая большая из них – скудность инвентаря. Очень хотелось бы его разнообразить. Для секции задействованы мячи, ракетки с факультета физической культуры и с моих собственных «запасов».

**Вы согласились на занятия с детьми, да еще и в свое свободное время. Не каждый пойдет на такой шаг...**

– Я представлял всю меру ответственности, а теперь очень рад, что веду спортивную секцию. Каждый раз вижу горящие глаза детей, которым нравится здесь, и это меня вдохновляет. Кроме того, у меня самого трое детей, которые с удовольствием посещают эту секцию, особенно младшая дочка. Ей – пять лет.

**Может быть, некоторые преподаватели, сотрудники университета, читая эту статью, впервые узнают о существовании секции, и тоже захотят привести к вам своих детей. Скажите, где и когда проходят занятия?**

– Наши занятия проходят по адресу: ул. Советская, 108, корпус №1, зал №1, в воскресенье с 14.00. до 16.00.

**Валентин Валентинович, какие у вас планы на будущее, связанные со спортивной секцией?**

– Самое главное – это обеспечить занятия спортинвентарем с помощью сотрудников ГГУ. В задумке – аренда бассейна и занятия в нем. И, конечно же, продолжать работу с детьми, тем более, что им это очень нравится.

А. БАРАШ, студентка гр. БЖ-52 филфака.



**На снимке:** ***В.В. Ткачев со своими юными воспитанниками.***

Фото В. ЧИСТИКА.

# ВЫБИРАЙ: КУРЕНИЕ ИЛИ ЗДОРОВЬЕ

«Привычка – вторая натура». Именно этим пытаются объяснить курение многие наши студенты. Некоторые из них и рады бы бросить это занятие, но не могут.

О том, что никотин – это чрезвычайно сильный яд, «незаметно» действующий преимущественно на нервную систему, задумываться им совсем не хочется.

Курение повышает риск всевозможных заболеваний. После очередной выкуренной сигареты наблюдается «ложное» улучшение самочувствия, настроения. А между тем возбуждаются нервные клетки, учащается дыхание и сердцебиение, нарушается ритм сердечных сокращений, тормозится деятельность клеток центральной и вегетативной нервной системы. Следствием является понижение трудоспособности, ослабление памяти. Вредно влияет никотин и на железы внутренней секреции: в частности, на надпочечники. Курение может быть главной причиной стойкого спазма сосудов нижних конечностей.

Страдает также пищеварительный тракт. Никотин увеличивает выделение желчного сока, что вызывает ноющую боль под ложечкой, тошноту; курящие люди чаще подвержены таким заболеваниям, как гастрит и язва.

Словом, курение оказывает пагубное воздействие на организм, особенно молодой, еще формирующийся. Задумайтесь над этим.

Сергей ВОЛЧЕНКО, Сергей ОСИПЕНКО, студенты факультета физической культуры.

Спорт

# ВПЕРВЫЕ И СРАЗУ ТРЕТЬИ



В г. Минске прошли соревнования по боксу в программе Республиканской студенческой универсиады, посвященной 60-летию Победы в Великой Отечественной войне.

Следует подчеркнуть, что впервые под руководством тренера Евгения Дистеля команда нашего университета приняла участие в соревнованиях по этому виду спорта. И для первого раза весьма успешно – в командном зачете наши боксеры стали третьими, уступив лишь Белорусскому государственному университету физической культуры и могилевчанам.

Серебряные награды в личных соревнованиях завоевали первокурсник Александр Брославский (69 кг) и студент 3 курса Денис Томашев (75 кг). Медали бронзового достоинства привезли в университет второкурсник Сергей Колос (75 кг), третьекурсник Михаил Грачев (91 кг) – все с факультета физической культуры и студент-заочник 1 курса специальности «Физическая культура» В. Мартынов.

# МИНИ-ФУТБОЛИСТЫ ЗАВЕРШИЛИ СПОР



Восемь команд собрал турнир по мини-футболу среди студентов нашего университета.

В финале ни одна из них не избежала поражения: юридический факультет со счетом 8:1 переиграл исторический и уступил экономическому – 1:2. В свою очередь, экономисты уступили историкам со счетом 5:6.

В итоге на первом месте – юридический, на втором – исторический и на третьем – экономический факультеты.

В. МАРЧЕНКО.

Чаму мы так гаворым?

## *АСПІРАНТ, КАНДЫДАТ*

У старажытнасці вялікія вучоныя мелі вучняў, галоўным лозунгам якіх было грэчаскае слова "аспіра" – імкнуся. Вучні імкнуліся пераняць ад настаўнікаў як мага больш ведаў, каб самім глыбей пранікнуць у таямніцы Сусвету. Слова аспірант паходзіць ад "аспіра" – чалавек, які імкнецца авалодаць ведамі. Зараз слова абазначае асобу, якая рыхтуецца да навуковай дзейнасці пры навукова-даследніцкім інстытуце або ВНУ.

У Старажытным Рыме кандыдатамі называлі асоб, якія шукалі выбарнай дзяржаўнай пасады. У час выбараў кандыдат павінен быў знаходзіцца на відным месцы, у белай тозе (кандыдзе) – знаку сумленнасці і незаплямленасці, каб усе выбаршчыкі добра бачылі яго. Адсюль паходзіць гэта слова. У пачатку XIX ст. у Расіі з'явілася вучоная ступень кандыдата, якая тады прысвойвалася лепшым выпускнікам універсітэтаў, а зараз – гэта малодшая навуковая ступень, якая прысуджаецца пасля абароны дысертацыі. Лацінскае ж "кандзідатус" – адзеты ў белае.

("Настаўніцкая газета").

## ПРИОБРЕТАЙТЕ КНИЖНЫЕ НОВИНКИ

**Вышло в свет практическое пособие для студентов 1 курса факультета иностранных языков. Его авторы – преподаватели Т.М. Познякова, Г.В. Ловгач, В.Г. Гуд.**

**Пособие можно приобрести на первом этаже учебного корпуса №5. Цена – 1 390 руб.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў эканамічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці доктара эканамічных навук, прафесара, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны **НАВУЧЫЦЕЛЯ Міхаіла Веніямінавіча** і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны».

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г.

Рэгістрацыйны № 263.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4221
Падпісана да друку 17 мая ў 11.30.